Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЛІСТАПАДА 2017 г. ПЯТНІЦА №217 (28581)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што беларусы шукаюць у Антарктыдзе?**
СТАР. 3




**Вясёлыя гісторыі чытачоў**
СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**

*«У міжурадавым пагадненні па ўзвядзенні БелАЭС, якое мы падпісалі яшчэ ў 2012 годзе, прадугледжана норма аб тым, што мы можам адпраўляць адпрацаванае ядзернае паліва на перапрацоўку ў Расію. Гэта значыць прынцыпова ў нас пагадненне падпісана, працоўныя дакументы ў стадыі распрацоўкі. У праекце атамнай станцыі прадугледжаны тэхналогіі па перапрацоўцы эксплуатацыйных ядзерных адходаў, якія пэўны час будуць захоўвацца на станцыі. Акрамя таго, для гэтай мэты будзе ўзводзіцца спецыяльнае збудаванне. Яно і сёння ёсць у рэспубліцы, таму што ў нас ядзерныя адходы не толькі ад атамнай станцыі — і медыцына, і іншыя галіны народнай гаспадаркі маюць такія адходы, і ў краіне арганізавана іх захоўванне».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9915 | ▲ |
| Еўра | 2,3100 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0750 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17217

# ВАСІЛЁВЫ САСНА І БЯРОЗА



**Каля вёскі Плянта Салігорскага раёна растуць пераплеценыя паміж сабой сасна і бяроза. Сюды часта прыязджаюць цікаўныя, каб сфатаграфавацца на фоне гэтага помніка прыроды. Па мясцовай традыцыі прыпыняюцца тут і вяселлі, маладыя абдымаюць дрэвы: лічыцца, што шлюб будзе навекі! Гэтыя дрэвы знайшоў мясцовы жыхар Васіль ТАТАРЫЦКІ паўвека таму.**

**— Яны раслі на ўскраіне балота, сярод хмызняку, — успамінае Васіль Канстанцінавіч. — Я якраз высякаў дубцы, каб зрабіць падушку пад стог сена, і ўбачыў гэтыя дзівосныя «абдымкі». Пашкадаваў, не стаў чапаць зусім маладзенькія дрэўцы. І іншым забараняў чыніць шкоду гэтай закаханай пары. Так яны і раслі, мацнелі...**

**Але два гады таму ўраган зламаў бярозу, пакінуўшы толькі тоўсты камель, які абвіваў сасну. Захавальнік гэтага месца дзядзька Васіль спадзяецца, што пры такой моцнай падтрымцы пакалечанае дрэва пусціць новыя маладыя галінкі і гісторыя незвычайнай вернасці працягнецца.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Шануй сваё!

## БАНДАНА З АРНАМЕНТАМ СЛУЦКАГА ПОЯСА,

### або Як пра набыткі продкаў расказаць у сучасных рэчах

**Як той казаў, пазнаюць нашу дачку і ў андарачку. У Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі нядаўна прайшоў міжнародны форум беларускага касцюма, былі зроблены тры выстаўкі, абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з традыцыйнай культурай, трансляцыяй гэтых помнікаў, вобразаў у сучаснае жыццё.**



Фота Ганны ЗАНКОВІЧ.

Трэба сказаць, што вучонымі сабрана каля ста сапраўдных арыгінальных комплексаў — гэта касцюмы з усёй Беларусі. Калі бачыш шыкоўныя строі, адмысловыя вышыўкі, адчуваеш, колькі працы ў іх укладалі жанчыны, як яны імкнуліся выглядаць прыгожа. І, галоўнае, наколькі актуальна гэта можа быць сёння.

— Касцюм усё паказвае. Вось мы такія людзі, ясныя, спакойныя, годныя. Нельга быць дрэнным чалавекам і мець такі касцюм, — заўважае **загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра Барыс ЛАЗУКА.** — Вы б бачылі, як мяняюцца жанчыны, калі апранаюць традыцыйныя касцюмы. У іх нават паходка такая, быццам яны на подыуме высокай моды. Я сам нешта падобнае перажыў, калі ўпершыню апрануў шляхецкі касцюм з поясам, ботамі, галаўным уборам, нават вусы самі ўверх закруціліся. Сённяшняя мода на вышыванкі — гэта бальзам на душу...

СТАР. 4

■ Скамянелая музыка

## Унікальны конкурс і 40 выставак за тры дні

### У Мінску праходзіць Нацыянальны фестываль архітэктуры

**Форум праводзіцца ўжо дванаццаты раз, і сёлета ён прымеркаваны да 950-годдзя Мінска. Адной з галоўных падзей фестывалю стане міжнароднае біенале маладых архітэктараў «Леанарда», а таксама агляд-конкурс на самы лепшы архітэктурны твор.**

— Нацыянальны фестываль архітэктуры выяўляе прагрэсіўныя ідэі, рашэнні і новыя творчыя імёны. Гэта форум таленавітых, натхнёных людзей, здольных думаць па-наватарску. Ён стаў адной са значных падзей у творчым і культурным жыцці Беларусі і спрыяе фарміраванню іміджу Мінска. На працягу апошніх гадоў вядомыя архітэктары дэманструюць інавацыйныя падыходы да архітэктурнай і горадабудаўнічай палітыкі Мінска, пад уплывам якіх сфарміраваўся новы вобраз сучаснага мегаполіса, — заўважыў на цырымоніі адкрыцця **віцэ-прэм'ер Васіль ЖАРКО.**

Такім чынам, фестываль — гэта не толькі збор спецыялістаў, гатовых падзяліцца сваімі ідэямі, але і нагода для замежнікаў па-новаму зірнуць на прыгажосць і гасціннасць Мінска. А паглядзець сапраўды ёсць на што: на думку прэм'ер-міністра, сярод архітэктурных візітных картак беларускай сталіцы — Палац Рэспублікі, Палац Незалежнасці, Нацыянальная бібліятэка, Музей Вялікай Айчыннай вайны, Чыгуначны вакзал, гатэль «Рэнесанс» і іншыя аб'екты.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# БЕЗ БАЗАВЫХ СУПЯРЭЧНАСЦЯЎ

### Так ацаніў работу нашай краіны з МВФ спікер верхняй палаты

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, правёў сустрэчу з выканаўчым дырэктарам Міжнароднага валютнага фонду ад групы краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Мікаэлай ЭРБЕНАВАЙ. Падчас яе абмяркоўвалася супрацоўніцтва нашай краіны з МВФ.**

«Актыўнае членства ў МВФ — тое, чым трэба даражыць. Нам неабходна ўдасканальваць нашы ўзаемаадносіны ў фондзе, — прапанаваў парламентарый. — Пры гэтым у нас няма базавых супярэчнасцяў. Мы выступаем за канструктыўнае супрацоўніцтва з фондам». Таксама спікер верхняй палаты беларускага парламента станоўча ацаніў работу спецыялістаў фонду, якая праводзіцца ў дачыненні да нашай краіны. Сенатар закрануў тэмы ўзгодненасці работы Беларусі і МВФ, наладжвання ўзаемнага дыялогу. У сваю чаргу Мікаэла Эрбенава выказала задаволенасць узроўнем супрацоўніцтва МВФ з нашай краінай, а таксама ад імя фонду станоўча ацаніла захады па стабілізацыі, прынятыя за апошнія два з паловай гады ўрадам і Нацыянальным банкам Беларусі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Фінансы

# ПЛЮС 1,7%

### Міжнародны валютны фонд палепшыў прагноз па росце беларускай эканомікі

**Пра гэта заявіў кіраўнік місіі МВФ па Беларусі Пітэр ДОЛМАН па выніках работы місіі ў рамках кансультацый. Кіраўнік місіі адзначыў, што вядуцца прадуктыўныя дыскусіі з уладамі, прыватным сектарам. Пітэр Долман выклаў асноўныя вывады і рэкамендацыі па выніках місіі.**

«Мы мяркуем, што эканамічны рост дасягне ў 2017 годзе ў Беларусі 1,7% і застанецца ў сярэднетэрміновай перспектыве каля 2%, калі ўрад не распачне дадатковых намаганняў. Аднаўленне росту ў значнай ступені тлумачыцца паляпшэннем знешніх умоў, але таксама намаганнямі ўрада па стабілізацыі, распачатымі на працягу апошніх двух з паловай гадоў», — расказаў Долман. Раней МВФ прагназаваў рост ВУП Беларусі па выніках 2017 года на ўзроўні 0,7%. Пітэр Долман растлумачыў, што мае на ўвазе, у прыватнасці, рэкордна нізкую інфляцыю, але адзначыў значныя рызыкі, звязаныя з наступствамі трох макраэканамічных крызісаў. У МВФ лічаць, што палітыка сацыяльнага адзінства, якая праводзіцца ўладамі, забяспечыла высокую занятасць і роўнасць. Пры гэтым існуюць абмежаванні развіцця для прыватнага сектара.

«Ураду давялося прыняць шэраг няпростых рашэнняў, уключаючы ўзмацненне жорсткасці грашова-крэдытнай і бюджэтна-падатковай палітыкі і далейшую лібералізацыю цэн. У выніку гэтага сёння мы зноў назіраем рост спажывання і інвестыцый, абменны курс стабілізаваўся, а ўзровень інфляцыі апусціўся да гістарычна мінімальных велічынь», — сказаў кіраўнік місіі МВФ па Беларусі.

Фонд рэкамендуе беларускаму ўраду звярнуць увагу на тры прыярытэтныя моманты. Рэкамендавана працягваць рэалізоўваць эканамічную палітыку, арыентаваную на макраэканамічную стабільнасць і стабільнасць фінансавага сектара, рэалізоўваць паглыбленыя рэформы ў сектары дзяржаўных прадпрыемстваў больш хуткімі тэмпамі, а таксама ствараць умовы для прыватнага сектара, каб ён мог іграць больш значную ролю, выступаючы рухальнай сілай эканамічнага росту. І трэцяе — важна забяспечыць значную падтрымку тым, хто найбольш уразлівы пры пераходзе на больш рынкавыя рэйкі, — павялічыць дапамогі па беспрацоўі і прыняць іншыя меры падтрымкі.

Кіраўнік місіі звярнуў увагу, што Беларусі варта скарыстацца больш спрыяльнымі знешнімі ўмовамі і аднаўленнем эканомікі, каб закласці больш надзейныя асновы для эканамічнага росту. «Персанал МВФ лічыць, што пры правядзенні больш надзейнай эканамічнай палітыкі і паскарэнні рэформаў эканамічны рост можа ў сярэднетэрміновай перспектыве павысіцца да 4%», — сказаў Пітэр Долман.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Расказаць пра свае праблемы ці проста падзякаваць

Як заўсёды, па суботах Мінгарвыканкам і адміністрацыі раёнаў праводзяць прамыя лініі. Расказаць пра сваю праблему і атрымаць кампетэнтны адказ можна, патэлефанаваўшы прадстаўнікам улады ў кожным рэгіёне краіны. Гэты раз, 11 лістапада, з 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:

наменнік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч. Тэл. 8 016 221 31 21;

наменнік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама АСКЕРКА Віктар Віталевіч. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы наменнік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч. Тэл. 8 023 275 12 37;

першы наменнік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ЖУК Іван Алейзавіч. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы наменнік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама МАКАР Ігар Мікалаевіч. Тэл. 8 017 500 41 60;

наменнік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч. Тэл. 8 022 250 18 69;

наменнік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама КРЭПАК Аляксандр Пятровіч. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Парламенцкі дзённік

# Пенсійны стаж і навацыі ў Банкаўскім кодэксе

**Чарговае пасяджэнне трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу было прысвечана разгляду законапраектаў, што датычацца міжнароднай, фінансавай і сацыяльнай сфер.**

Асаблівую цікавасць у дэпутатаў выклікаў дакумент са змяненнямі і дапаўненнямі ў Закон «Аб пенсійным забеспячэнні». Адказваючы на пытанні журналістаў, **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** нагадала, што ў студзені бягучага года былі ўнесены змяненні ў Закон «Аб пенсійным забеспячэнні». Тады вельмі праблемным было пытанне так званай пенсійнай пасткі. У яе трапляюць некалькі катэгорый грамадзян. Гэта ваенныя, што не выпрацавалі ваенны стаж; людзі, якія даглядаюць інвалідаў і не маюць магчымасці «напрацаваць» стаж...

— Мы для іх таксама знізілі страхавы стаж да дзесяці гадоў, — паведаміла міністр.

Расказала Ірына Касцевіч і пра абноўленую версію Дэкрэта №3. Гэта версія дакумента знаходзіцца ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

— Сакрэтаў ніякіх няма, — адзначыла кіраўнік ведамства. — Ужо неаднаразова казалі, што абноўленая версія Дэкрэта №3 накіравана перш за ўсё на садзейнічанне і стымуляванне занятасці ў дачыненні да тых грамадзян, якія сапраўды хочуць працаваць.

**Ігар КОЛБ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы,** выступіў судакладчыкам па праекце закона, што ратыфікуе міжурадавае пагадненне паміж Беларуссю і Кітаем аб развіцці міжнародных грузавых перавозак і супрацоўніцтве ў рамках эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Ён адзначыў, што ратыфікацыя пацягне за сабой развіццё аўтамабільных, чыгуначных перавозак.

— Відаць, будзе станоўчы ўплыў на стан транспартнай інфраструктуры, — лічыць парламентарый. — Гэта крок наперад.

Што да прыцягнення ў нашу краіну кітайскіх інвестыцый, то тут надзейным інструментам, па словах Ігара Колба, стане стварэнне свабодных эканамічных зон, лагістычных баз, спрашчэнне мытнага заканадаўства, «каб перамяшчэнне грузаў ішло па больш спрошчанай форме».

**Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах,** расказала пра законапраект, што ўносіць змяненні і дапаўненні ў Банкаўскі кодэкс Рэспублікі Беларусь. Дакумент праходзіў праз яе камісію.

— Актыўна развіваецца банкаўская сфера, што, безумоўна, патрабуе змяненняў адпаведнага заканадаўства — у прыватнасці Банкаўскага кодэкса, — адзначыла старшыня профільнай камісіі. — Перш за ўсё навацыі скіраваны на ўдасканаленне дзейнасці нябанкаўскіх фінансава-крэдытных арганізацый. Гэтыя арганізацыі працуюць у нас з 2001 года, іх актыўнасць павялічылася ў 2015—2016 гадах. Усе мы ведаем нябанкаўскую крэдытна-фінансавую арганізацыю АРІП (Адзіная разліковая інфармацыйная прастора). Удасканаленне заканадаўства ў гэтай галіне дазволіць павысіць якасць банкаўскіх паслуг.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Унікальны конкурс і 40 выставак за тры дні


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мы пастаянна ўдасканальваем фармат мерапрыемства і гэты раз праводзім не толькі традыцыйныя конкурсы, майстар-класы, круглыя сталы, але таксама ў рамках форуму асобна пройдзе міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 150-годдзю архітэктара Івана Жаўтоўскага. Гэта савецкі архітэктар, чые творы ўпрыгожваюць Маскву і Санкт-Пецярбург, але нарадзіўся і сфарміраваўся як асоба і прафесіянал ён у Пінску. Для нас важна, што фестываль не толькі свята дойлідаў, мы хочам, каб гэты форум станавіўся магнітам для гараджан, каб людзі маглі пазнаёміцца з апошнімі работамі архітэктараў, знайсці нешта цікавае для сябе, выхаваць свой густ. Магчыма, на фестывальных выстаўкі бацькі прывядуць сваіх дзяцей, якія здзівяцца ўбачанаму, і не выключана, што ў будучыні яны стануць архітэктарамі, — адзначыў **намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый СЕМЕНЯКЕВІЧ.**

Усяго за тры дні фестывалю пройдзе каля 40 выставак. Наведвальнікі Палаца мастацтва, дзе размясцілася экспазіцыя, змогуць азнаёміцца з усімі гранямі сучаснай архітэктуры і дызайну. Тут і прэзентацыі завершаных і яшчэ не да канца рэалізаваных праектаў ад комплексаў міжнароднага значэння да прыватных дамоў і кватэрных інтэр'ераў. І індывідуальныя экспазіцыі скульптараў і мастакоў. Асобная пляцоўка выдзелена, здавалася б, такому простаму прадмету інтэр'ера, як крэсла, у стварэнні якога фантазія дызайнераў дакладна не ведае межаў. Зэдлік з вушамі слана ў ролі крылаў або крэсла, сядзенне якога зроблена з цвікоў, што тырчаць угору, — гэта яшчэ толькі «кветачкі»...

Сярод удзельнікаў не толькі беларусы, можна, напрыклад, падрабязна пазнаёміцца з сучаснай архітэктурай Падняабеснай — ёю немагчыма не ўразіцца.

Што да біенале «Леанарда», то ў ім свае работы нароўні з беларусамі прадстаўляюць маладыя архітэктары з 17 краін: Расіі, Малдовы, Украіны, Кыргызстана, Славеніі, Харватыі, Італіі, Грэцыі, Польшчы і іншых. Усяго — больш за 120 праектаў. Па словах **старшыні Беларускага саюза архітэктараў Аляксандра КОРБУТА,** конкурс можна назваць унікальным. Такіх міжнародных форумаў сярод маладых архітэктараў усяго тры-чатыры ў свеце. У Міжнародным саюзе архітэктараў ён мае вялікую падтрымку. Узнагароджанне пераможцаў адбудзецца 11 лістапада — у дзень закрыцця фестывалю.

Уваход на ўсе мерапрыемствы форуму вольны.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Сі Цзіньпін назваў візіт Трампа ў Кітай гістарычным

Па словах старшыні КНР, візіт прэзідэнта ЗША быў паспяховы, бакам удалося распрацаваць дарожную карту развіцця кітайска-амерыканскіх адносін. Кітай і ЗША падчас візіту Трампа падпісалі пагадненні на агульную суму ў $253,4 млрд. Візіт Трампа ў КНР праходзіў з 8 па 10 лістапада. Гэта частка яго турнэ па Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне — самага працяглага з усіх, праробленых за апошнія 25 гадоў амерыканскімі прэзідэнтамі.



### Курс біткойна перавысіў 7,8 тыс. долараў

Курс біткойна пабіў чарговы рэкорд — дасягнуў 7848 долараў на фоне навін аб адмове ад прымянення пратакола Segwit2x. Прымяненне пратакола магло прывесці да яшчэ аднаго падзелу біткойна на дзве крыптавалюты, аналагічна таму, як з'явіўся bitcoin cash, адзначае РБК. Аб адмене прымянення пратакола паведаміў кіраўнік праекта Segwit2x Майк Белш. З пачатку года біткойн падаражэў прыкладна на 800%. Капіталізацыя сукупнага рынку крыптавалют на пачатак лістапада склала 188,8 млрд долараў. Доля біткойна складае 61,5% з капіталізацыяй больш за 116 млрд долараў.

### У Саудаўскай Аравіі ўпершыню ў гісторыі арыштавалі прынцэсу

У рамках маштабнай кампаніі па выкараненні карупцыі ў верхніх эшалонах улады Саудаўскай Аравіі ўпершыню ў гісторыі была арыштавана прынцэса Рым бінт аль-Валід ібн Талал, паведаміла выданне Arabi21. Раней па абвінавачанні ў карупцыі і адмыванні грошай быў арыштаваны бацька прынцэсы — міжнародны інвестар аль-Валід ібн Талал ібн Абдэль-Азіз аль Сауд, адзін з найбагацейшых людзей свету, якога называюць арабскім Уорэнам Бафетам. У артыкуле аб чарговым арышце не прыводзіцца падрабязнасцяў, аднак адзначаецца, што ў Саудаўскай Аравіі хваляю арыштаў тлумачаць барацьбой з карупцыяй, у той час як на Захадзе звязваюць тое, што адбываецца, з выкараненнем палітычных праціўнікаў наследнага прынца Махамеда бін Салмана.

### ААН папярэдзіла пра пагрозу найстрашнейшага голаду ў Емене

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый папярэдзіла аб магчымых страшных наступствах блакады, уведзенай у дачыненні да Емена кааліцыяй пад кіраўніцтвам Саудаўскай Аравіі. Яе ахвярамі могуць стаць мільёны людзей. Дзеянні кааліцыі пагоршаць і без таго «катастрафічную» гуманітарную сітуацыю ў Емене. Пад пагрозай голаду апынуцца мільёны чалавек. Акрамя таго, блакада выкліча масавую эпідэмію халеры, заявіў намеснік генеральнага сакратара ААН па гуманітарных пытаннях Марк Лаўкок, словы якога прыводзіць катарскі тэлеканал Al Jazeera.



■ Акцэнт на здароўе

# ЛЕПШ РАНЕЙ, ЧЫМ НІКОЛІ

## Айчынная служба акушэрства і гінекалогіі з'яўляецца сёння эталоннай для многіх краін

**Па паказчыку дзіцячай і жаночай смяротнасці Беларусь займае 4-е месца, па індэксе становішча маці — 24-е. Па прагнозах, паказчык дзіцячай смяротнасці на канец года будзе адным з самых нізкіх у Еўропе. Аб гэтым паведаміў міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Валерый МАЛАШКА падчас адкрыцця ў Мінску X з'езда акушэраў-гінеколагаў і неанатолагаў. Урачы-спецыялісты не толькі нашай краіны, але і блізкага і далёкага замежжа, у тым ліку Партугаліі, Германіі, Ізраіля, абмяркавалі пытанні арганізацыі дапамогі маці і немаўлятам, захавання рэпрадуктыўнага здароўя.**

Мацярынская смяротнасць за апошнія дзесяць гадоў знізілася ў нашай краіне ў дзесяць разоў. Наогул у 2015 годзе ў свеце былі дасягнуты гістарычны мінімум па гэтым паказчыку. Некалі ў родах гінула столькі жанчын, што ніводная пандэмія з гэтым не магла параўнацца, а цяпер размова ідзе пра адзінкавыя выпадкі. Звязаны яны з цяжкім станам здароўя парадзіх — напрыклад, парокам сэрца, паталогіяй сасудаў галаўнога мозга і г. д. А таму планаванне цяжарнасці было і застаецца надзвычай актуальным для любой пары.

Для Беларусі гэта важна і ў тым сэнсе, што пачынаючы з 2011 года колькасць жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту — асабліва ў групе 20—34 гадоў — няўхільна зніжаецца. Адпаведна зніжаецца і колькасць нованароджаных. Між тым пастаянна павышаецца ўзрост уступлення ў шлюб і нараджэння першынца. Усё больш сем'яў сутыкаюцца і з праблемай бясплоднасці.

— Я быў запрошаны на гэты з'езд для абмеркавання праблемы бясплоднасці ў жанчын — адной з самых актуальных праблем у акушэрстве і гінекалогіі свету, — кажа **старшыня кангрэса «Спрэчныя пытанні акушэрства і гінекалогіі Еўропы» Зіён БЭН РАФАЭЛЬ** (Ізраіль). — Некалькі гадоў таму жанчына ўступала ў шлюб у 25—30 гадоў і, адпаведна, нараджала ў 30—35, а цяпер расце колькасць жанчын, якія нараджаюць у 40—45. На жаль, пасля 35 гадоў здольнасць да зачацця імкліва зніжаецца з кожным годам. Як расце працэнт бясплоднасці ў прынцыпе, так расце ён і сярод жанчын пасля 35...

Дапамагчы пераадолець гэту праблему заклікана экстракарпаральнае апладненне. Сёння нідзе ў свеце такая працэдура не гарантуе стапрацэнтнага выніку, але ўдасканаленне тэхналогіі пастаянна працягваецца. У нашай краіне створана сістэма дзяржаўнага крэдытавання шлюбных пар, якія плануюць рабіць ЭКА. Для гэтага неабходна звярнуцца ў арганізацыю аховы здароўя, дзе праводзіцца працэдура (яны ёсць сёння не толькі ў сталіцы, але і ў Гродне, Віцебску). Там ім выдадуць фінансавы дакумент, на падставе якога праводзіцца льготнае крэдытаванне ў межах 5 тысяч рублёў (летась на гэта было ў цэлым па краіне выдаткавана каля 70 тысяч рублёў). Калі першая спроба абыходзіцца танней, то другую частку крэдыту можна выкарыстоўваць на паўторную спробу. Штогод праводзіцца звыш 3 тысяч цыклаў ЭКА, але толькі частка з іх аказваецца паспяховымі, што абумоўлена прычынамі бясплоднасці, узростам пары.

Пасля наведвання адной з буйных клінік сталіцы Зіён Бэн Рафаэль быў прыемна здзіўлены ўбачаным — аснашчэнне, абсталяванне, як ён кажа, адпавядаюць самым высокім патрабаванням, а беларускія ўрачы аказваюць меддапамогу паводле сусветных стандартаў. Пры гэтым нават калі ўзнікаюць нейкія пытанні, то сёння дзякуючы інтэрнэту ўрачы рознага ўзроўню з розных краін могуць абмеркаваць іх анлайн.

**Заслужаны дзеяч навукі Расійскай Федэрацыі, член-карэспандэнт РАН, доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык кафедры акушэрства і гінекалогіі з курсам перынаталогіі Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў Віктар РАДЗІНСКІ** выказаў сваю думку адносна дамашніх родаў: «Пад вокнамі кожнага дома нерэальна забяспечыць машыну хуткай дапамогі з акушэркай, рэанімацыйнай брыгадай... Чуткі пра тое, што 30 працэнтаў галандскіх жанчын нараджаюць дома, не пацвярджаюцца. Таму што разгарнуць аперацыйную у кожным доме — неймаверна дарагое задавальненне. А калі гэтага не зрабіць, будуць выпадкі з сумным фіналам, і такія выпадкі, калі жанчыну з кровацячэннем пасля хатніх родаў «хуткая» не паспявала давезці да клінікі, маюць месца ў Расіі. Сёння трэба імкнуцца да таго, каб у радзільнях ствараць хатнюю атмасферу, каб муж, мама, сястра прыходзілі да жанчыны, падтрымлівалі яе, але побач з аперацыйнай і рэанімацыяй. Урач абавязаны аказаць меддапамогу, калі яго выклічуць, але арганізоўваць роды дома ён не мае права... Свет сёння змагаецца і з лішнімі ўмяшаннямі ды ўжываннем непатрэбных прэпаратаў падчас цяжарнасці. У нас па дурасці 70 працэнтаў цяжарных атрымліваюць нейкія лекі, прызначаныя ўрачамі пад уздзеяннем тых людзей, што іх агрэсіўна прасоўваюць. Пытанне аб прымяненні падчас цяжарнасці но-шпы ў развітых краінах ужо вырашана — яе не прызначаюць. З усіх вітамінаў доказную базу мае толькі фолievая кіслата — і тое не падчас, а да наступлення цяжарнасці».

Са слоў Валерыя Малашкі, у радзільных дамах сёння ўжо створаны самыя камфортныя ўмовы. У 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска за 3 тысячы рублёў прапануецца пражыванне амаль у кватэры з кухняй, гасцінай, індывідуальным персаналам. Установы аховы здароўя актывізавалі апошнім часам работу па перадабортным кансультаванні, чым выклікалі нейадназначную рэакцыю ў грамадстве. Але медработнікі проста выконваюць свае абавязкі. Яны павінны дапамагчы жанчыне зрабіць правільны выбар — параіць, растлумачыць, засцерагчы. Практычна ў любой радзільні ёсць і магчымасць партнёрскіх родаў. Сістэма падрыхтоўкі да родаў з удзелам мужчын, наведванне імі спецыяльных заняткаў, як лічыцца, умацоўваюць сям'ю, нараджаюць глыбокае пачуццё любові да дзіцяці, спрыяюць прывязанасці паміж самімі партнёрамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*protas@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Парывісты вецер на фоне дажджоў

## У нядзелю ў паўночных раёнах магчыма фарміраванне невялікага снежнага покрыва

**Сапраўды вільготнае і халоднае надвор'е чакаецца ў Беларусі ў выхадныя, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У найбліжэйшыя дні ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. Тэмпературны фон пачне паступова паніжацца і да канца тыдня наблізіцца да кліматычнай нормы. Сёння ўдзень на тэрыторыю Беларусі завітаюць атмасферныя франты. Чакаецца воблачнае надвор'е, у многіх раёнах пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ў другой палове дня павысіцца да 4—9 цяпла. У суботу франтальныя падзелы, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы, абумовяць на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы, якія ўдзень будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 7 градусаў, удзень — 4—10 цяпла.

Захаваецца няўстойлівае надвор'е і ў нядзелю. Больш таго, тэмпературны фон крыху панізіцца. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, па поўначы з мокрым снегам, так што ў паўночных раёнах краіны магчыма фарміраванне невялікага снежнага покрыва. У асобных раёнах чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, удзень — 1—7 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак і аўторак надвор'е будзе вызначаць зона паніжанага атмасфернага ціску. Па паўднёвым усходзе чакаюцца апдкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, толькі па паўднёвым усходзе будзе 4—5 цяпла. Удзень таксама будзе не зусім камфортна — усяго ад плюс 1 да плюс 7 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# Экспедыцыя ў Антарктыду — не экстрэмальны турызм,

## або Як стаць палярнікам?

**Менш чым праз тыдзень стартуе 10-я Беларуская антарктычная экспедыцыя, самая прадстаўнічая за ўсе гады нашай самастойнай прысутнасці на лядовым кантыненце — да Паўднёвага полюса Зямлі адправяцца адразу сем чалавек. Аб меркаваным паўднёвым паходзе расказаў Аляксей ГАЙДАШОЎ — нязменны кіраўнік усіх беларускіх экспедыцый пачынаючы з 2007 года, адзін з ініцыятараў і распрацоўшчыкаў дзяржаўнай праграмы «Маніторынг палярных раёнаў Зямлі і забеспячэнне дзейнасці арктычных і антарктычных экспедыцый».**



Фота БЕЛТА.

### «Дзяды» і навабранцы

Паводле сусветнай статыстыкі, ад 25 да 35 працэнтаў палярнікаў вяртаюцца ў Антарктыду зноў. Дзесяцігадовы вопыт беларускіх экспедыцый гэтыя лічбы таксама пацвярджае. Чацвёра з сямі ўдзельнікаў ужо былі раней на Паўднёвым полюсе Зямлі. Аляксей Гайдашоў падлічыў, што агульны час яго асабістага знаходжання за 50-м градусам паўднёвай шыраты набліжаецца да 8 гадоў, а калі ўлічваць дарогу, якая можа расцягнуцца больш чым на тры месяцы (спачатку самалётам, а потым — на караблі), то ён адсутнічаў дома больш як 10 гадоў. Але нават калі была б магчымасць вярнуцца назад, то нічога ў сваім жыцці ён не стаў бы мяняць.

— Сярэдні ўзрост удзельнікаў нашай сёлетняй экспедыцыі — 25—35 гадоў, — расказаў Аляксей Гайдашоў. — І, скажу шчыра, гэтыя маладыя людзі, асабліва з улікам іх прафесійнага досведу, — наша надзея на будучыню, паколькі ў 2019—2020 гадах мы плануем перайсці да круглагадовых зімовачных мерапрыемстваў. Не пабаюся гучных слоў, але ўпэўнены, што і краіна, і Акадэмія навук могуць на іх разлічваць.

### Не толькі вучоныя

Натуральна, усіх цікавіць, як можна трапіць у Антарктыду, бо гэта ж не звычайнае падарожжа і нават не экстрэмальны турызм? Сярод патрабаванняў — добрае здароўе, прафесіяналізм і адказнае стаўленне да справы. Кожны ўдзельнік павінен быць спецыялістам у якой-небудзь з навуковых сфер, прычым вельмі высокага ўзроўню. Акрамя таго, ён мусіць выконваць і працу па іншых профілях. Але галоўнае ва ўмовах ізаляцыі ад Вялікай зямлі — усё ж поўная псіхалагічная сумяшчальнасць удзельнікаў экспедыцыі, іх кантактнасць, камунікабельнасць і маральна-валявыя якасці. Каб можна было цалкам давяраць чалавеку, што знаходзіцца побач з табой. У таго, хто адпраўляецца ў экспедыцыю, павінна быць свая тэма і гатоўнасць выконваць работу і па іншых напрамках.

Экспедыцыя толькі на 20—25% складаецца з навуковых супрацоўнікаў. Астатнія — гэта тэхнічны персанал: механікі, кіроўцы, электрыкі. Кожная пазіцыя дублюецца двума-трыма кандыдатамі, як у атрадзе касманаўтаў. Так можна быць упэўненым, што ў экстранай сітуацыі экспедыцыя не будзе сарванай і спецыяліста, які адсутнічае з якой-небудзь прычыны, будзе кім замяніць. Калі навуковых супрацоўнікаў камандзіруе Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, то на астатнія штатныя пасады могуць прэтэндаваць высакакласныя спецыялісты з іншых ведамстваў і арганізацый.

Аляксей Гайдашоў тлумачыць, што шмат навукоўцаў у Антарктыдзе быць не павінна, таму што там навуковыя адкрыцці сусветнага маштабу не робяцца. Гэта, хутчэй, штодзённая руцінная, нават рамесніцкая, праца, збор навуковага матэрыялу, які будзе аналізавацца ўжо на радзіме ў лабараторыях. Ён паведаміў, што ў планах Нацыянальнай акадэміі навук — у наступныя два гады завяршыць будаўніцтва ў раёне гары Вячэрняй ва Усходняй Антарктыдзе першай чаргі Беларускай антарктычнай станцыі. Яно распачалося ў канцы 2015 года. Падчас 8-й экспедыцыі быў змантаваны першы аб'ект станцыі — трохсекцыйны модуль кіравання сувяззю і навігацыяй, а падчас 9-й — закладзены другі аб'ект з установачнай платформай. Мантаж прайшоў паспяхова — «фундамент» быў змантаваны за рэкордна кароткі час (32 гадзіны), пасля чаго зверху ўсталявалі першы з васьмі блокаў.

### Чакаем прарыву

У планах сёлетняй экспедыцыі — змантаваць чатыры новыя секцыі, якія ўключаюць навуковыя лабараторыі, жылыя памяшканні, памяшканні для санітарна-гігіенічных мэт.

Сярод іншых задач — правядзенне навуковых даследаванняў па таіх напрамках, як вывучэнне стану і маніторынг навакольнага асяроддзя Антарктыкі ў месцы базіравання станцыі, мікрабіялогія, даследаванне стану азонасферы, ультрафіялетавай радыяцыі, клімату і іншых прыродных параметраў, дэталёвае даследаванне наземных і марскіх біялагічных рэсурсаў Антарктыкі з мэтай ацэнкі перспектыў іх далейшага выкарыстання, назіранні ў інтарэсах касмічнай праграмы, геафізічны маніторынг. Даследаванні будуць праводзіцца з выкарыстаннем прыбораў беларускіх распрацоўшчыкаў.

На борт судна «Акадэмік Фёдараў» ужо адпраўлены экспедыцыйны груз. Цяпер судна накіроўваецца ў Кейптаўн.

— Каб пашырыць нашы магчымасці і падоўжыць на месяц тэрміны навуковых назіранняў, падрыхтоўчых і інжынерна-тэхнічных работ, было прынятае рашэнне загадзя адправіць у Антарктыду групу з чатырох чалавек. Яны будуць дабірацца да месца базіравання на самалёце. Вылет адбудзецца ў найбліжэйшыя дні. Другая група ўдзельнікаў экспедыцыі, а гэта тры чалавекі, вылятае ў Кейптаўн 24 лістапада, там далучаецца да Расійскай антарктычнай экспедыцыі і на борце судна «Акадэмік Фёдараў» разам з грузам адпраўляецца на месца базіравання экспедыцыі, — удакладніў Аляксей Гайдашоў. — Разгрузка судна каля гары Вячэрняй плануецца ў перыяд з 14 па 17 снежня. Экспедыцыя будзе працаваць да канца лютага — сярэдзіны сакавіка.

Трэба дадаць, што для таго, каб канчаткова замацавацца на ледзяным кантыненце, толькі мець сваю палярную станцыю там ужо недастаткова. З боку міжнародных арганізацый урастаюць патрабаванні да навуковых вынікаў, якія атрымліваюцца падчас экспедыцыі. Прычым патрабуюцца публікацыі ў сур'ёзных міжнародных выданнях.

— Я ўпэўнены, што мы стаім на парозе сур'ёзных адкрыццяў, — запэўнівае Аляксей Гайдашоў. — У нас ёсць даследаванні, ад якіх мы ў наступныя пяць гадоў чакаем прарыўныя рэчы...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*nikalaeva@zviazda.by*

# БАНДАНА З АРНАМЕНТАМ СЛУЦКАГА ПОЯСА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Знаёмства з сапраўдным нацыянальным касцюмам можа змяніць уяўленне пра саміх беларусаў?***

— Нашу традыцыю ў XIX — пачатку XX стагоддзя пачалі перадаваць у двух крайне супрацьлеглых варыянтах. Гэта або караляўна ў саламянай кароне, што ідзе па вуліцы з гарманістам, або трактоўка такая: лапці, аборы, анучы, праца беспрасветная... Ісціна недзе пасярэдзіне. Звярніце ўвагу: нідзе ў традыцыйным аўтэнтычным касцюме вы не ўбачыце галаўнога ўбора ці ўпрыгажэнняў, выкананых з саломы. Ніводная кабета ў цвярозым розуме саламянае ўпрыгажэнне на галаву б не начапіла з той простай прычыны, што салома — гэта той матэрыял, якім ужо пакарысталіся. А ў жаночым вобразе (жанчына-маці, дзяўчынка чысцюткая, бялюткая) цанілася цнатлівасць, добрапрыстойнасць.

Гаворачы менавіта пра традыцыйны касцюм, мы не можам уявіць кабету без фартуха, а мужчыну — без пояса. Фартух служыў заслонай: калі жанчына насіла дзіцятка, закрывала лона сваё, каб захаваць плод. Сімвалам, знакам абароны ад нядобрага быў і пояс. Калі паказваю студэнтам кераміку эпохі неаліту, звяртаю ўвагу на тое, дзе знаходзіўся арнамент — на гарлавіне гаршка. А потым глядзім, дзе арнамент на касцюме — на рукавах, на каўняры, — там, дзе адкрывалася цела. Ён заўсёды служыў у якасці абярэга і нёс больш глыбокі семантычны змест. Чырвонае на белым — гэта заўжды асацыявалася з памяццю, традыцыямі, продкамі, сучасным жыццём. Бо чырвоны, як і чорны, колер сімвалізаваў жыццё, упэўненасць, перакананасць, шчасце. Часта ў мяне пытаюцца, напрыклад, якім сэнсам у вышыўцы напоўнены ромб. Трактаваць арнамент так прымітыўна — вельмі небяспечная забава. Мы не можам зараз сказаць, што абазначае гэты знак. Я праціўнік таго, каб знайсці тут «кветку шчасця», «каханне», значок, які абазначае «жыццё», і інш. Арнамент — гэта ўвасабленне нейкіх глыбінных спрадвечных уяўленняў нашых прашчураў, якія дайшлі да нас праз стагоддзі, тысячагоддзі.

***— Нацыянальныя элементы касцюма сёння ў пашане. Што далей?***

— Цяпер трэба быць вельмі ўдумлівымі і асцярожнымі. Трэба працаваць з моладдзю: будучымі дызайнерамі, распрацоўшчыкамі касцюмаў, рэчаў, каб пасля не нараджаліся вобразы, якія з народнымі традыцыямі не маюць нічога агульнага. Важна, каб яны ведалі мінулае, шанавалі. Без гэтага нельга выхаваць адукаванага і шчаслівага чалавека. Нідзе, ні ў якой арнаментацыі, вы не знойдзеце праяўлення адмоўнага, знакаў смерці, гібелі, трагедыі. Беларускі касцюм, арнаменты (таксама як і нашы абрады) — гэта толькі станоўчае ўспрыняцце свету, пазіцыянаванне сябе як асобы, якая — частка прыроды, ландшафту, матэрыяльнага асяроддзя.



**Кожны ўзор аўтэнтычнага касцюма нясе пэўную сімволіку.**

Фота Ганны ЗАНКОВІЧ.

***— Што трэба ўлічваць пры рэканструкцыі, капіраванні, стылізацыі традыцыйнага касцюма?***

— Гэта даволі вострая праблема. Так, мы вельмі часта бачым не зусім адэкватнае ўспрыняцце і выкарыстанне беларускага касцюма, напрыклад, танцавальнымі, харавымі калектывамі. Узяць музейны касцюм, дакладна скапіраваць і перанесці на сцэну не заўсёды магчыма, бо сцэнічныя законы дыктуюць свае падыходы. Напрыклад, танец патрабуе пэўных рухаў, а касцюм можа замінаць, і нейкія танцавальныя нумары будуць выглядаць смешна. Альбо зблізу мы бачым на фартуху складаныя арнаменты, але на адлегласці яны не будуць успрымацца, значыць, некаторыя элементы павінны быць больш буйныя, выразныя. Акрамя традыцыйнага народнага, быў яшчэ і шляхецкі касцюм. Сёння ў нашым музеі можна ўбачыць рэканструкцыю касцюма жанчыны 70—80-х гадоў XIX стагоддзя, гэта дыпломная работа студэнткі ўніверсітэта культуры і мастацтваў, выкананая з поўным паўтарэннем усіх нюансаў. Касцюм пашыты па лякалах XIX стагоддзя...

*Адзін з элементаў шляхецкага касцюма — славуты слуцкі пояс. Іх вытворчасць была адноўлена зусім нядаўна. Барыс Лазука працаваў не толькі над аднаўленнем станка, які да нашага часу не захаваўся. Дзякуючы яму з'явіўся і музей гісторыі слуцкіх паясоў, у Слуцку ён размешчаны літаральна за сто метраў ад таго месца, дзе стаялі карпусы мануфактуры Маджарскіх. Пасля прагляду экспазіцыі наведвальнікі праз сцяну з антывандальнага шкла могуць паназіраць і за работай станка, які тчэ ў аўтаматычным рэжыме.*

*Праграма адраджэння слуцкага пояса адкрыла масу розных праблем. Спрэчкі вяліся нават наконт таго, як капіраваць пояс. Выцвілым, з паўтарэннем усіх тых недахопаў, што ёсць у музейных экспанатаў, ці інакш?*

— Паколькі мы планавалі ствараць не толькі экспанаты для музеяў, але і выконваць, напрыклад, задачу дзяржаўных падарункаў, вырашана было рухацца па шляху аднаўлення і танальнай ды колеравай рэканструкцыі, — расказвае Барыс Андрэевіч. — У нас створаны дзяржаўны падарункавы фонд, прадметы для якога адбіраюць эксперты, спецыялісты ў розных галінах, вучоныя, мастацтвазнаўцы і тэхнолагі. Для нас галоўнае, як гэты прадмет (гэта можа быць кераміка, жывапіс, скульптура, шкло, ткацтва, зброя і інш.) пазіцыянуе нашу традыцыю, культуру. Так, копія пояса, выкананага з сапраўдных залатых ці срэбных нітак, — гэта ўзровень вельмі дарагога падарунка. Але ў Слуцку ткуць копіі паясоў і са штучнага шоўку і мітанітаў, якія імітуюць золата і срэбра, і кошт іх на парадак ніжэйшы. Да кожнай копіі пояса выдаецца сертыфікат (дзе ёсць інфармацыя, што пояс, напрыклад, выкананы з пэўнага арыгінала, з якога матэрыялу зроблены і колькі ўтрымлівае золата і срэбра). Радуе, што ў Слуцку пачалі рабіць і сувенірную прадукцыю, напрыклад, такую, як чахольчыкі для мабільных тэлефонаў, закладкі.

**«Беларускі касцюм, арнаменты (таксама як і нашы абрады) — гэта толькі станоўчае ўспрыняцце свету, пазіцыянаванне сябе як асобы, якая — частка прыроды, ландшафту, матэрыяльнага асяроддзя».**

Сёння ў беларускіх музеях захоўваецца 11 паясоў-арыгіналаў. Так, мы можам зрабіць іх копіі, а што далей? Узяць узор для капіравання з музейнага фонду іншай дзяржавы — гэта мільён праблем. На прыкладзе тых паясоў, якія былі мне даступныя (я працаваў у музеях Расіі, Украіны, Польшчы), а гэта больш за 300 узораў, я паспрабаваў зрабіць сістэматызацыю, у тым ліку вычleніць матывы (напрыклад, ліста, ружы, кветкі і інш.) і напісаў кніжку «Слуцкія паясы і еўрапейскі тэкстыль XVIII стагоддзя. Малы лексікон». Гэта метадычка ў руках мастакоў. Так, сёння мы можам ствараць паясы, якіх раней не існавала, але выкананыя ў адпаведнай стылістыцы. Уласна, у XVIII стагоддзі заказчык, які прыязджаў да Маджарскіх, таксама мог выбіраць з пэўных загатовак ці заказваць нешта новае.

***— Ці магчыма малюнкі слуцкіх паясоў перанесці на сучасныя тканіны, пасцельную бялізну?***

— Пояс — гэта свецкая рэч мужчынскага гардэробу, але яна ішла і на пашыў літургічнага адзення. Зразумела, сёння ў ім не выйдзеш. Але ж фантазіраваць можна. Напрыклад, у Мінску можна ўбачыць асвятляльныя слупы, на апорах якіх узоры слуцкіх паясоў. Добрая ідэя стварыць дэкаратыўныя дызайнерскія элементы на прыпыначных пляцоўках ці пано, якія могуць упрыгожваць фасады дамоў, дзе б тэма слуцкага пояса таксама прагучала. Мы рыхтуемся да знакавых міжнародных спартыўных падзей. Спартсменаў ганаруюць медалямі на стужках, на якіх магчыма паўтарыць нейкія элементы нацыянальнага ўзору. Альбо возьмем мэблю. У пачатку XIX стагоддзя ў стылістыцы ампір яе абівалі паласатымі тканінамі. А чаму не выкарыстаць палосы, якія ёсць на слуцкіх паясах? Адна з маіх студэнтак зрабіла цудоўныя эскізы мяккіх пляжных сумак з узорамі слуцкіх паясоў, з элементамі беларускага арнаменту. У другой — тэма слуцкіх паясоў згадваецца ў жаночых упрыгажэннях. Больш за ўсё мяне ўразіў хлопец, які сказаў, што хоча зрабіць касцюм байкера з аздобай, як на поясах. Здавалася б, гэта значыць, сумясціць несумяшчальнае. І што ж прыдумаў хлопец — выкарыстаў медальёны са слуцкага пояса, перавёў іх у чорна-белы колер і зрабіў банданы — вельмі стыльныя. Трэба ўключыць мазгі, жаданне. Так, рэч, прадмет, які бытаваў у XVIII—XIX стагоддзях, мы не можам скапіраваць і перанесці ў сучаснае жыццё. Павінен быць «пераклад» на сучасную мову з улікам ментальнасці, зручнасці, вобразнасці. Прычым гэта датычыцца не толькі слуцкіх паясоў, тое ж самае можна сказаць і пра традыцыйны касцюм, нашу арнаментацыю ці іншыя здабыткі матэрыяльнай нацыянальнай культуры.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

***Больш фота глядзіце на сайце www.zviazda.by***


**Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднорайагросервис», расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра 12 декабря 2017 года**

| Вид аукциона открытый | Лот №1 | Лот №2 |
|---|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 8 капитальных строений (диспетчерская, автозаправочная, здание СТО на 100 автомобилей, мастерская, здание трансформаторной подстанции, проходная, столярный цех, склад), канализационную (фекальную) сеть, канализационную (ливневую) сеть, электрическую сеть 0,4 кВ, асфальтобетонное покрытие, зеленые насаждения, ограждения | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 3 капитальных строения (административное здание, кафе-бар, здание гостиницы), канализационную (фекальную) сеть, канализационную (ливневую) сеть, асфальтобетонное покрытие, ограждения |
| Начальная цена продажи | **1 770 625,25 рублей** (с учетом НДС 20%) | **423 900,83 рублей** (с учетом НДС 20%) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 422086003101000005 площадью 6,8678 га | 422086003101000107 площадью 0,2674 га и 422086003101000108 площадью 0,5114 га |
| Месторасположение земельных участков | **Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра** | |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Гроднорайагросервис», г. Гродно, ул. Понемуньская, 27, тел. 8 (0152) 755568** | |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования | |
| Сумма задатка | 177 062,53 рублей | 42 390,08 рублей |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546. | |
| Дата проведения аукциона | **12 декабря 2017 года** | |
| Время проведения аукциона | 12.00 | |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** | |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 | |
| Дата и время начала приема документов | 8 ноября 2017 года 8.00 | |
| Дата и время окончания приема документов | 6 декабря 2017 года 17.00 | |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «БРЕСТСКИЙ ЭЛЕКТРОМЕХАНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»**

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена | Размер задатка |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Капитальное строение (инв. №100/С-47113) – здание административно-хозяйственное, пл. 656,1 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121200000001000050 пл. 0,9576 га (назначение – для обслуживания административно-хозяйственного и производственного зданий завода) по адресу: г. Брест, ул. Городская, 60А, в составе: хозяйственно-бытовой корпус (литер А3/к), покрытие из ж/б плит (литер Б), пл. 520 м², гравийно-песчаное покрытие (литер В), пл. 850 м² | 107 370,00 рублей без учета НДС | 1 872,00 рубля |
| Лот №2 | Капитальное строение (инв. №100/С-28350) – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, пл. 1908,0 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121200000001000050 пл. 0,9576 га (назначение – для обслуживания административно-хозяйственного и производственного зданий завода) по адресу: г. Брест, ул. Городская, 60А/1, в составе: здание участка древообработки (литер А 1/к), металлический навес (литер В), пл. 730 м², асфальтовое покрытие (литер Б), пл. 2550 м² | 271 170,00 рублей без учета НДС | 1 872,00 рубля |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, г. Брест, ул. Мицкевича,10, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 22 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52,**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 21 ноября 2017 г. до 17.00**



## Аляксандр ЯРМАШ:

# «ПРАМЫ ЭФІР — ГЭТА ЗАЎСЁДЫ АДРЭНАЛІН»

**Вядучы спартыўных навін на тэлеканале «Беларусь 1» прыадчыняе сакрэты тэлевізійнай «кухні». Чаму сюжэт, які доўжыцца паўтары хвіліны, рыхтуецца мінімум некалькі гадзін, як грыміруюць вядучых-мужчын і чаму тэлебачанне кардынальна змяніла жыццё Аляксандра ЯРМАША.**

***— Аляксандр, пачнём з навін, што паведамляць прыемней за ўсё?***

— Вядома, расказваць аб перамогах нашых спартсменаў або камандаў значна прыемней. Тым больш, за гады работы многія сталі навяцца для цябе добрымі прыяцелямі і таму перажываеш за іх выступленні неяк асабліва. Расказваць пра паражэнні больш складана. Напрыклад, асабіста мне, чалавеку, які ў свой час займаўся футболам, не вельмі прыемна паведамляць пра нашы правалы ў гэтым відзе спорту, а апошнім часам, на жаль, гэта адбываецца даволі часта.

***— Напэўна, многіх гледачоў цікавіць пытанне: тэкст, які вы чытаеце ў эфіры, рыхтуе сам вядучы?***

— Так, у асноўным. Не можа быць такога, каб я прыйшоў на эфір і бачыў яго ўпершыню. Бываюць вельмі рэдкія выключэнні, напрыклад, у тым выпадку, калі навіна паступіла да нас, калі я знаходжуся ўжо ў прамым эфіры. Калі ты працуеш у спорце, павінен быць гатовы да таго, што сітуацыя ў матчы ці яго вынік можа змяніцца ў адну секунду. На студыі ў нас вісіць шыльда, якая абвяшчае, што з тэлефонам заходзіць туды нельга, але прызнаюся, часам парушаюць гэтае правіла менавіта спартыўныя журналісты, таму што за вынікамі ў інтэрнэце даводзіцца сачыць да апошняй секунды перад выхадам у эфір, а бывае, што і па ходзе выпуску навін.

***— Раскажыце, як рыхтуецца сюжэт для навін?***

— Я прыязджаю на матч, гляджу яго, адзначаю гульцоў, якія найбольш ярка выяўляюць сябе па ходзе сустрэчы. Як правіла, з імі заўсёды лягчэй дамовіцца аб каментарыі ці міні-інтэрв'ю, асабліва калі каманда выйграла. Калі спартсмены церпяць паражэнне, часта адмаўляюцца падыходзіць да камеры, тады прыходзіцца неяк выходзіць са становішча. Па маіх назіраннях, часцей за ўсё гэта здараецца з футбалістамі і хакеістамі, а людзі, якія лягчэй за ўсё ідуць на кантакт, — гэта, напэўна, гандбалісты. Зразумела, што ёсць выключэнні, напрыклад, Віталь Радзівонаў — чалавек, які заўсёды гатовы размаўляць. А ёсць людзі, у якіх і пасля перамогі слова не выцягнеш. Я лічу, гэта няправільна, бо журналісту трэба мець зносіны са спартсменам, можа яму і самому гэтага не асабліва хочацца. Гэта, у першую чаргу, патрэбна людзям, якія падтрымліваюць і хварэюць за тваю каманду, мы выключна пасярэднікі. Спартсмены павінны разумець, адмаўляючы журналісту, яны адмаўляюць тым людзям, якія за іх перажываюць.

Сюжэт для выпуску навін, як правіла, доўжыцца паўтары хвіліны, а каб зрабіць яго, трэба выдаткаваць пару гадзін. У кожным кірунку маёй працы ёсць свае любімыя моманты — і ў падрыхтоўцы сюжэтаў, і ў вядзенні навін. Аднак, прамы эфір — гэта заўсёды адрэналін, колькі б ты ні працаваў, і гэта крута.

***— Сур'ёзныя памылкі ў рабоце былі?***

— Зразумела, што здараюцца ўсякага роду агаворкі, так адразу і не прыгадаю, што можна было б прывесці ў прыклад. Мы чытаем навіны па суфлёры, а бывае такое, што ён знікае, напрыклад. Заўсёды для гэтага з сабой бяром раздрукаваны на паперы тэкст, які ляжыць у нас на стале. У экстранай сітуацыі пераключаемся на яго і працягваем працаваць.

***— Перад эфірам вас грыміруюць?***

— Гэта залежыць ад неабходнасці. Пра сябе я жартую з грымёрамі, што вечна знаходжуся ў пераходным узросце. Перыядычна можа з'явіцца нейкі вугор, можа быць яшчэ з-за таго, што я вельмі люблю салодкае *(смяецца)*. Але, як правіла, мне хапае пудры. Яшчэ такі момант, заўсёды неабходна сачыць за памерам свайго шчаціння. Ад начальніка можа прыйсці паведамленне: «Саша, ты як пасля другога дня вяселля. Яшчэ раз выйдзеш так у эфір — пазбаўлю прэміі». Вядома, свой знешні выгляд пажадана абмяркоўваць з кіраўніцтвам, бо гэта свайго роду імідж канала, ты не можаш рабіць з сабой усё, што заўгодна, ёсць рамкі, пэўныя нормы.

> **«На студыі ў нас вісіць шыльда, якая абвяшчае, што з тэлефонам заходзіць туды нельга, але прызнаюся, часам парушаюць гэтае правіла менавіта спартыўныя журналісты».**

Часам здараюцца і форс-мажоры. Як практычна ўсе спартыўныя журналісты, я вяду досыць актыўны лад жыцця, у тым ліку гуляю ў гандбол у зборнай беларускіх журналістаў. Аднойчы ў дзень, калі мне трэба было выходзіць у эфір, быў на трэніроўцы, партнёр кідаў з блізкай адлегласці і трапіў мне проста ў вока. Спачатку думаў, што ўсё вельмі дрэнна, некалькі гадзін аднаўляўся зрок, ну і вядома, застаўся след на тварах. Грымёры вельмі пастараліся, вечарам змог выйсці ў эфір. Вока, вядома, яшчэ балела, таму я вельмі часта міргаў, але, спадзяюся, ніхто з гледачоў не звярнуў на гэта ўвагі.

***— Чаму вы наогул калісьці выбралі тэлебачанне?***

— Я нарадзіўся і жыў у Гродне, скончыў Гродзенскі дзяржаўны політэхнічны каледж і стаў майстрам будаўніча-мантажных работ. Па размеркаванні паехаў у Вялікую Бераставіцу. Так, я не клаў на будоўлі цэглу, а быў свайго роду начальнікам, але мне гэта абсалютна не падабалася. Калі табе 19, наўрад ці хтосьці ўспрымае ў гэтай ролі, ды і стаяць над людзьмі з палкай — гэта не маё. Неяк са сваім таварышам, Аляксеем Багдановічам, які цяпер працуе на АНТ, а тады працаваў на гродзенскім тэлебачанні, гулялі ў футбол. Ён не мог наведаць футбольны матч «Нёман» — БАТЭ, а расказваць пра яго з экрана тэлевізара яму было неабходна. Я быў на гэтай гульні, таму змог літаральна ў некалькіх словах апісаць сустрэчу, у выніку ў сваім сюжэце ён выкарыстаў менавіта маю фразу. У гэты момант я падумаў, чаму б мне не памяняць сваё жыццё і не стаць журналістам. Неяк пасля футбола жартам сказаў Лёшу: «Я табе зайздрошчу, ты бясплатна ходзіш на футбол, а потым за тое, што пішаш пра яго, яшчэ і грошы атрымліваеш». Ён пасмяяўся і прапанаваў сваю дапамогу, калі раптам я збяруся стаць журналістам. Гэтая ідэя была лёгкая, неназойлівая, але неўзабаве я пачаў рыхтавацца да паступлення на журфак.



Гандбаліст зборнай Беларусі Вадзім Гайдучэнка ў ролі журналіста.

Рабіў некалькі сюжэтаў на гродзенскім тэлебачанні. Памятаю, што тады вельмі дрэнна ўспрымаў свой голас. Цяпер ужо прызвычаіўся да яго.

***— Неўзабаве пасля свайго паступлення пачалі працаваць?***

— Так, усё ж такі я быў ужо дарослы, паступіў у ВНУ не пасля школы і ў Мінску за штосьці трэба было жыць, таму ўжо праз месяц падышоў да аднаго з выкладчыкаў і папрасіў тэлефоны спартыўных тэлевізійных рэдакцый. Атрымалася так, што пайшоў працаваць на СТБ, дзе пачынаюць сваю тэлевізійную кар'еру многія студэнты. Часта гэты канал так і расшыфроўваюць, не Сталічнае тэлебачанне, а студэнцкае.

***— Памятаеце свой першы сюжэт?***

— Напэўна, больш яго памятае мая мама, я, шчыра кажучы, не вельмі. Яна проста гэтага вельмі моцна чакала, бо бачыла, што я хачу развівацца менавіта ў гэтым кірунку, і вельмі радавалася за мяне, калі ўбачыла і пачула па тэлевізары. Патэлефанавала мне, і мы з ёй трошкі паплакалі.

***— Пра што вы марыце ў прафесійным плане?***

— Мне б вельмі хацелася паспрабаваць сябе ў ролі каментатара. Я ажыццявіў гэта ўсяго аднойчы, працуючы на СТБ. Потым удзельнічаў у конкурсе каментатараў на «Беларусь 5», у якім выйшаў у фінал, але не перамог. Кажуць, не хапіла эмоцый... Шчыра скажу, было трошкі крыўдна. Думаю, усё роўна калі-небудзь гэта да мяне прыйдзе. Дарэчы, пасля гэтага кастынгу прайшоў літаральна месяц ці два і мяне запрасілі працаваць на «Беларусь 1».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Тэлесеткі

# НА КРЫЛАХ ПЕСНІ




**Крыху больш чым праз два тыдні ў сталіцы Грузіі пачнецца 15-ы па ліку Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2017». Удзел у ім бяруць сёлета 16 краін, у тым ліку Партугалія, якая вяртаецца на форум пасля дзевяці гадоў адсутнасці.**

Прадстаўніца Беларусі Хелена Мерааі, як і іншыя ўдзельнікі, працягвае актыўна рыхтавацца да конкурсу — рэпеціравала нумар і песню, удасканальвае англійскую мову, а таксама ўдзельнічаць у прома-канцэртах. Дарэчы, ужо на наступным тыдні, 14 лістапада, дзяўчына ў складзе вялікай творчай зборнай нашых артыстаў і музычных калектываў выступіць у Тбілісі ў праграме Дня беларускай культуры ў Грузіі. Крыху пазней у грузінскую сталіцу прыбудзе афіцыйная дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Белтэлерадыёкампаніі Іванам Эйсмантам, каб падрыхтаваць сцэнічны нумар беларускай канкурсанткі і яе ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах «Еўрабачання». Па традыцыі, наша каманда павязе з сабой прома-пакет, у які ўваходзяць буклеты, дыскі, маляўнічыя паштоўкі і постары, а таксама адмысловы пазл і каляндар.

20 лістапада цырымонія адкрыцця дасць старт дзіцячаму «Еўрабачанню-2017», а таксама пройдзе жараб'ёўка ўдзельнікаў. Фінальны гала-канцэрт, нагадаем, адбудзецца 26 лістапада на сцэне Алімпійскага палаца ў Тбілісі.

### Тым часам

Удзел у «Еўрабачанні-2018», якое налета пройдзе ў Партугаліі, афіцыйна пацвердзілі 42 краіны. Тэлеканал-арганізатар загадзя прадставіў асноўны лагатып будучага шоу (марская ракавінка) і яго слоган — «All Aboard!» («Усе на борт!»). А ўжо ў канцы лістапада ў продаж трапіць першая партыя білетаў на канцэрты «Еўрабачання».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

# НА СУЧАСНЫЯ ТЭМЫ

**«НАСТАЎНІКІ»**
**МІР, 12 і 14—15 лістапада**



Няўдалы жарт падчас эфіру токшоу «Пагутарым?» выклікае грандыёзны скандал, які ставіць тлусты крыж на кар'еры тэлевядучага Арсенія Платонава. Учарашні ўлюбёнец публікі вымушаны вярнуцца да родных у невялікі падмаскоўны гарадок. Выпадкова ён сустракаецца з новым дырэктарам школы, якую скончыў дзесяць гадоў таму, і той настойліва запрашае выпускніка правесці для старшакласнікаў некалькі факультатываў на тэму «Сакрэты поспеху».

А ў школе тэлевядучы сустракае сваю былую аднакласніцу, у якую некалі быў безадказна закаханы. Цяпер яна — настаўніца малодшых класаў, без мужа, затое з двума дзецьмі. Арсеній, з якога яшчэ не зляцеў сталічны глянец, упэўнены, што ў сваім цяперашнім статусе зможа лёгка скарыць сэрца прыгажуні... У чым ён памыліўся, а ў чым меў рацыю, і чым наогул гісторыя скончылася, гледачы даведаюцца з 8 серый гэтага меладраматычнага міні-серыяла.

**«АНАТОМІЯ ТЭРОРУ»**
**АНТ, з 13 лістапада**




Стваральнікі шматсерыйнага дакументальнага праекта Агульнанацыянальнага тэлебачання маюць намер разабрацца ў вытоках і прыродзе аднаго з самых страшных выклікаў сучаснага свету — тэрарызму.

Вежы-блізняты ў Нью-Ёрку, тэатральны цэнтр на Дуброўцы ў Маскве, рэдакцыя французскага часопіса «Charlie Hebdo»... На працягу больш як паўгода журналісты пабывалі на месцах гучных тэрактаў новага часу, сустракаліся з іх відавочцамі і сваякамі загінулых, гутарылі са спецыялістамі, якія прысвяцілі жыццё барацьбе з тэрорам. Геаграфія здымак атрымалася надзвычай шырокая: Францыя, Германія, Ізраіль, Палесціна, Сірыя, ЗША... Напрыклад, прыадкрывае сакрэты праекта вядучы Тэнгіз Думбадзэ, у Сірыі ўдалося сустрэцца з прэзідэнтам Башарам Асадам, а ў Чачні сустрэча з Рамзанам Кадыравым прайшла ў гістарычным месцы ў высакагор'і.

Чаму і дзеля чаго людзі становяцца тэрарыстамі, ці існуюць спосабы барацьбы з гэтай навалай? Адказы на гэтыя пытанні аўтары «Анатоміі тэрору» паспрабуюць даць з самай першай серыі цыкла.

**«ГАРАЖ»**
**Беларусь 3, 18 лістапада ў 21.05**



18 лістапада споўніцца 90 гадоў з дня нараджэння «караля кінакамедыі», рэжысёра, сцэнарыста, акцёра і паэта Эльдара Разанава. Да круглай даты многія каналы пакажуць разанаўскія стужкі: так, на АНТ выйдзе «Сцеражыся аўтамабіля» ў колеры, а на «Беларусь 3» — трагікамедыя «Гараж».

На што здольныя інтэлігентныя і прыстойныя людзі, калі справа датычыцца іх матэрыяльных інтарэсаў? Як паказаў чарговы сход гаражнага кааператыва супрацоўнікаў навуковага інстытута, якім трэба выкрасліць са спіса пайшчыкаў некалькіх «лішніх», — практычна на любую подласць і брыдоту. І хоць часы татальнага дэфіцыту мінулі, але многія непрыглядныя рысы чалавечага характару засталіся ўсё тыя ж. А значыць, заснаваны на рэальных падзеях, «Гараж» актуальны нават амаль праз 40 гадоў пасля выхаду на экраны.

## Панядзелак, 13 лістапада

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.10** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Ніткі лёсу». (16+).**
**12.40, 14.30, 15.25 Меладрама «Спадчынніца». (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Нашы.
**22.10 Серыял «След». (16+).**
**23.50** Арэна.
**0.45** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.05, 21.05** Тэлебарометр.
**9.30** Капейка ў капейку. (12+).
**10.05** Кіслы comment. (12+).
**10.15** М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды». (12+).
**11.10** «Свет навыварат». (16+).
**12.10** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**12.45** «Вяселле ўсляпую». (16+).
**14.45** Анімацыйны фільм «Смурфікі». (6+).
**16.30 Фантастыка «Асобная думка». (12+).**
**19.15** Суперлато.
**20.10** «Навучы жонку руліць». (16+).
**21.40** Два рублі.
**22.00** КЕНО.
**22.05** «ЛавЛавCar». (16+).
**23.15 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме». (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Цымес і пражаныя бабы.
**8.05, 12.00, 19.55** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20** «Наперад у мінулае».
**9.45** «Навукаманія» (6+).
**10.10** «Камертон». Народная артыстка Беларусі Ніна Ламановіч.
**10.30, 14.40 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).**
**12.50** «Беларусь как песня». Ансамбль «Песняры».
**13.15** «Славянскі базар у Віцебску — 1998».
**14.10** «Музеі Беларусі».
**16.05, 21.05** «Маршалы Сталіна». Аляксандр Васілеўскі (12+).
**16.45** «Час кіно».
**16.55, 21.45 «Людзі на балоце». Маст. фільм. (12+).**
**19.25** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Уладзімір Ганчарук.
**20.10** «Беларуская кухня». Ячэня і драны блін.
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**7.35** Тэніс. Кубак федэрацыі. Фінал. Беларусь — ЗША.
**9.40** Пра спорт. Вынікі тыдня.
**10.25** Самба. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**12.05** Спорт-мікс.
**12.15** Вялікі спорт. Ток-шоу.
**13.00** Рэаліці-шоу «Снежны барс».
**13.30** Піт-стоп.
**14.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. БК «Ніжні Ноўгарад» — «Цмокі-Мінск».
**15.50** Скачкі на батуце. Чэмпіянат свету. Індывідуальныя скачкі. Жанчыны. Мужчыны. Фіналы.
**16.55** Футбол. Таварыскі матч. Грузія — Беларусь. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**19.00** Спорт-цэнтр.
**19.10** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Ак Барс» (Казань). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**22.05** Час футбола.
**22.50** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10** «Геніі і ліхадзеі» (12+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Дэльфіны на Свіслачы. Навука ваяваць» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Наша жыццё».
**22.15** «Анатомія тэрору» (16+).
**23.00** «Вячэрні Ургант» (16+).
**23.40** Начныя навіны.
**23.55** «Час пакажа» (16+).

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне» (12+).
**10.00** «Тыдзень спорту».
**10.40 «Водбліскі». Серыял (16+).**
**11.35** «Самая карысная праграма» (16+).
**12.15** «Францыск Скарына».
**12.55** «Вялікі горад».
**13.50 Драма «Форэст Гамп» (12+).**
**16.15** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.50** «Тэледоктар» (12+).
**17.35** «Трэцяя сусветная вайна. Сакрэтныя распрацоўкі і зброя будучыні» (16+).
**18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна» (16+).
**23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**23.50** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.40** «Соль». Музычнае шоу. «Рекорд Оркестр» (16+).

### МІР

**6.00 Серыял «Вы заказвалі забойства» (16+).**
**7.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00, 3.00** «Любімыя акцёры» (12+).
**10.30, 13.15 Серыял «Фёдараў» (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25** «Іншы свет» (12+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 4.50 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Востраў непатрэбных людзей» (16+).**
**21.10 Серыял «Аддзел 44» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Зайздрасць багоў» (16+).**
**1.35 Маст. фільм «Мілы, дарагі, каханы, адзіны» (0+).**
**3.30 Маст. фільм «Першая пальчатка» (0+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пакой смеху». (16+).
**12.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**13.35** «Наша справа». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.35 Серыял «Марозава». (12+).**
**22.10, 23.10 Серыял «Тайны следства-16». (12+).**
**23.55** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45** «За гранню». (16+).
**10.25, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.30 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**
**11.05 Серыял «Сведкі». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «НЗ. Расследаванне». (16+).
**14.25** «Зоркі сышліся». (16+).
**16.30** «Ты не паверыш!» (16+).
**17.30 «Чакай мяне». (12+).**
**19.45 Серыял «Павуцінне». (16+).**
**23.20** «НЗ.by».
**23.45** «Вынікі дня».
**0.15 Серыял «Асноўная версія». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.55, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 16.00** Для дзяцей: «Адказвайка».
**7.30** Раніца на восьмым.
**11.20 Камедыя «Забаўная мордачка» (12+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне» (16+).**
**14.30 Прыгоды «Востраў Нім» (12+).**
**16.05** «Мультпарад».
**17.35 Серыял «Дарагі доктар».**
**19.00 Серыял «Каханне і помста».**
**20.00 Серыял «Дзеці Арбата» (12+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Аблога» (16+).**
**23.00 Серыял «Ракіроўка» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.50** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** «Сэрцы за каханне» (16+).
**10.00** «Проста кухня». (16+).
**10.40** «Поспех» (16+).
**12.40** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00** Make-over шоу «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Гатэль «Элеон». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.30** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Баявік «Скалалаз». (16+).
**0.00** Серыял «Празорлівая». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**6.35, 8.05, 20.30** «Правілы жыцця».
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Юрый Бялоў.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.35, 22.50** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**9.25** «Італьянскае шчасце». Дак. фільм.
**9.50** «О'Генры». Дак. фільм.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.10, 0.45** ХХ стагоддзе. «Чалавек і закон. Талгат Нігматулін». 1986 год.
**12.05** «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
**12.50** «Белая студыя».
**13.30** «Адна шпіёнка і дзве бомбы». Дак. фільм.
**14.30** «Біблейскі сюжэт».
**15.10, 1.40** Да юбілею Даніэля Барэнбойма. Канцэрт у Буэнас-Айрэсе.
**16.15** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**16.40** «Агора». Ток-шоу.
**17.45** «Больш, чым каханне». Васіль Шукшын і Лідзія Федасеева-Шукшына.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Да 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. «Хто мы?» «1917: Пераварот? Рэвалюцыя? Смута?»
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.10** «Шалёныя мадэрністы». Дак. серыял.
**22.10** «Саці. Нясумная класіка...»
**23.40** Сусветныя скарбы.
**0.15** «Магістр гульні». «Пячорны Пікаса».
**1.35** «Колер часу». Васіль Паленаў. «Маскоўскі дворык».
**2.45** «Роберт Фолкан Скот». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1972. 2012 год (16+).
**7.00, 11.25, 13.15, 14.30, 17.15, 20.15, 21.40, 23.00, 23.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10** Праграма «Вакол смеху». «Рэтра». 1981 год (12+).
**8.45** М/ф «Казка для Наташы» (0+).
**9.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**10.00** Маст. фільм «Ювелірная справа» (16+).
**12.00** «Зямля—Паветра». Гурт «Ночные снайперы». 2002 год (16+).
**13.30** «Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна» з Міхаілам Задорнавым». «У кожным жарце ёсць доля... жарту». 1992 год (12+).
**15.00** Маст. фільм «Мы, ніжэйпадпісаныя» (16+).
**17.30** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Бедная Маша» (16+).
**20.40** Маст. фільм «Лімонны торт» (16+).
**21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**23.30** «Сядзі і глядзі» (16+).
**1.00** Дак. фільм «Генеральны сакратар» (12+).
**1.50** Маст. фільм «Гонкі па вертыкалі». 3-я серыя (16+).
**4.00** «Колба часу» (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 12.30, 20.50, 1.15** Горныя лыжы. Кубак свету.
**5.00, 8.30, 17.30, 0.00** Рэгбі. Тэставы матч. Францыя — Новая Зеландыя.
**9.30, 14.30, 21.50** Снукер. «Мастэрс».
**14.00** Футбол. «ФІФА».
**18.45** Фігурнае катанне. Этап Гран-пры.
**20.45** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
**2.45** Watts.

### Кінакамедыя

**0.45** Камедыя «9 месяцаў строгага рэжыму». (16+).
**2.20** Камедыя «Кахае не кахае». (16+).
**4.15** Камедыя «Вялікае вяселле». (16+).
**5.55** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму». (12+).
**8.05** Камедыя «Вялікі Стэн». (16+).
**10.15** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода». (16+).
**12.15** Камедыя «Спытайце Сіндзі». (16+).
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.20, 15.10** «Шоу Камедыянты». (16+).
**16.00** Меладрама «Тэлі і Толі». (12+).
**17.30** Меладрама «Вяселле найлепшага сябра». (12+).
**19.30** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці». (16+).
**21.15** Драма «Мачаха». (12+).
**23.40** Камедыя «Дзяўчына з Манака». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.05** «10 самых» (16+).
**8.35** «Доктар І...» (16+).
**9.05, 19.00, 2.50** «Каралёк — птушачка пеўчая». Серыял (16+).
**10.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.25** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**12.55** «Без падману» (16+).
**13.45** «Як вярнуць мужа за 30 дзён». Камедыя (12+).
**15.30, 4.20** «Нераскрытыя тайны» (16+).
**16.25** «Папялушка 2:0» (16+).
**17.20** «Развітанне» (16+).
**18.10** «Вар'яцтва. Плата за талент». Дак. фільм (16+).
**20.50, 2.00** «Ежа, я люблю цябе» (16+).
**21.50** «Рэвізора» (16+).
**22.55** «Вокладка» (16+).
**23.25** «Легенда аб Шукальніку». Серыял (16+).
**0.15** «Д'ябал носіць Prada». Камедыя (16+).
**5.05** «Часова даступны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 17.45** Вялікая афёра (16+).
**8.30** Інструкцыі не прыкладаюцца (12+).
**11.00** Чалавек, якога не было (16+).
**13.25** Дарагі Джон (16+).
**15.40** Дзённік пакаёўкі (16+).
**20.10** Марыя-Антуанэта (16+).
**22.30** Экстрасэнс (16+).
**0.35** Вялікі Лябоўскі (18+).
**2.40 11.14** (18+).
**4.15** Філосафы: урок выжывання (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Чэмпіёны. Найхутчэй. Найвышэй. Наймацней. (6+).
**8.20** Сірата казанская (6+).
**10.00** Дублёр (16+).
**11.40** Кадкіна кожны ведае (6+).
**13.15** Гэта твой дзень (0+).
**15.05** Я кахаць цябе буду, можна? (12+).
**16.20, 4.20** Трое ў ліфце, калі не лічыць сабаку. Серыі 1—2-я (12+).
**18.20** Мама дарагая! (16+).
**20.20** Івановы (12+).
**22.10** Тры таварышы. Серыя 1-я (16+).
**23.20** Тры таварышы. Серыя 2-я (16+).
**0.25** Уладар сноў (16+).
**2.05** Уцёкі (16+).

### National Geographic

**6.00** Код небяспекі. (12+).
**6.25, 7.35, 17.15, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**6.50** Сапраўдны геній. (12+).
**8.00, 10.25, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.10** Шаша праз пекла. (12+).
**9.35** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны. (12+).
**11.55** Аўта-SOS. (12+).
**12.40, 21.45** Пачатак. (12+).
**13.25, 20.15** Гульні розуму. (12+).
**15.40, 18.45** Сёмы кантынент. (12+).
**16.30, 19.30, 2.25** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.00, 23.20** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).
**21.00, 0.50, 3.55 1917**: адзін год — дзве рэвалюцыі. (16+).
**22.35** Апакаліпсіс: Першая сусветная вайна. (16+).
**0.05** Злавіць кантрабандыста. (16+).
**1.35** Антарктыка. (12+).
**4.40** Гады небяспечнага жыцця. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 6.20** Харчовая фабрыка. (12+).
**10.00, 16.00** Горная брыгада. (16+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00** Уцячы ад пагоні. (12+).
**14.00, 5.30** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Разбуральнікі легенд. (16+).
**23.00, 3.50** Захавальнікі зямлі леапардаў. (12+).
**0.00** Мяцежны гараж. (16+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (18+).
**2.55** Аперацыя «Выратаванне дома». (12+).




## ПРАВЕРКА НА ДАРОГАХ

...Гаражы ў нас недалёка стаяць — метраў за 50. Што, здавалася б, добра? Але ж многія жанкі на чым свет праклінаюць іх, «пасуць» сваіх мужчын, каб туды не трапілі... Хоць і ведаюць, што пільней — не пільнуй, а калі нехта наважыўся чарку-другую кульнуць, то ён гэта зробіць. А ўжо ў пятніцу і пагатоў, бо гэта ж «дзень шафёра»: тыдзень працоўны скончаны, наперадзе — два выхадныя...

Карацей, мужыкі ў гаражах сабраліся, грошы з кішэняў стрэслі, ганца ў краму адправілі.

Той па вуліцы хуценька ідзе, ні аб чым непрыемным не думае, як раптам:

— Стой... Чаму без флікера? — пытае ў яго міліцыя.

Васіль Іванавіч зірк на рукаво і сапраўды — няма абярэга.

— Забыўся, хлопчыкі! Болей не буду! Калі ласка, прабачце!

— Не-е, — адмаўляюцца тыя, — бо ведаем: калі сёння прабачым, значыць, заўтра ты зноў без флікера пойдзеш, а вось калі штраф заплаціш...

— Хлопцы, няма чым плаціць. Далібог! Я ў краму іду, сябры паслалі. Грошай — у абрэз. Адпусціце... Слова даю: без флікера — больш ні кроку, бо ён жа ёсць, дома...

Карацей, досыць доўгая ў іх размова была: і прасіўся Іванавіч, і маліўся, а грошы на штраф усё роўна аддаў, прычым да капейкі.

Трэба, значыць, «пустому» назад вяртацца? А ногі не нясуць. І галава ад думак аж пухне: што хлопцам сказаць?

Але ж сябры на тое і сябры, каб усё зразумець, каб разам пасмяяцца, а потым яшчэ раз скінуцца ды адправіць у краму іншага ганца — ужо з флікерам.

Факт, што вечар той скончыўся добра. А вось гісторыя — мела працяг.

Рэч у тым, што дзён праз колькі Іванавіч пайшоў свіней карміць: з двума поўнымі вёдрамі падаўся ў бок хлява і яшчэ здалёку ўбачыў, што насустрач яму... праваральшчыкі флікераў. «Што за халера? — падумаў мужчына. — Тут жа ніякіх дарог, ніякай небяспекі... Хоць з іншага боку — хлявы побач з гаражамі, праезд там ёсць. І вечарэе ўжо... А я без флікера...»

Уцяміўшы гэта, Васіль Іванавіч цяжанька ўздыхнуў, паставіў на зямлю вёдры, дастаў з кішэні грошы і моўчкі падаў міліцыянеру.

— Што — нават спрачацца не будзеш? — папытаўся той.

— А які мне сэнс? Мінулы раз грошы забралі, калі я ў краму па святое — па бутэльку ішоў! Дык што ўжо казаць цяпер, калі ў хлеў да свіней... Адно папрашу: я ім гэтыя вёдры зараз выльлю і буду назад вяртацца. Дык хоць тады не чапайце...

З той пары шмат часу прайшло, але Васіль Іванавіч усюды ходзіць з флікерам. Так, на ўсякі выпадак. Бо навучаны.

**Кацярына Будзіловіч,**
*Гродзенская вобласць.*

## ЦЁТКА МАША, ДЫ НЕ НАША?

Ніхто спрачацца не будзе: прыгожую ўсмешку робяць прыгожыя зубы.

Ад іх жа і практычнай карысці шмат, бо імі ядуць — штодня і рознае. Таму зубы трэба берагчы, а інакш «масты», пратэзы, а гэта ўжо зусім не тое.

Карацей, хто пра што — я зноў пра зубы, бо, як аказалася, напісала пра іх не ўсё.

Пачну здалёк: здарылася гэта недзе ў 60-м, не да нашай эры, а ў 1960-м. У нас найлепшай радней былі тады дзве цёткі: Анюта і Соня. Яны вельмі любілі свайго старэйшага і адзінага брата (майго, значыць, тату) і як маглі песцілі. То-бок прыязджалі — нібы ў тым фільме: «Дзецям — марозіва, бабе — кветкі», а ў нас было — дзецям цукеркі, а брату — пляшка, чаго ўсе і чакалі... Ад цёткі Анюты — даўжэй (яна бывала ў нас зрэдку), ад цёткі Соні — часцей. Яна жыла паблізу, у Рагачове, а таму і гасціла амаль штотыдзень.

Бацька, карацей, купіўшы новы каляндар, адразу садзіўся і наперад адзначаў, у якія змены працуе Соня (іх было тры), а літарай «В» пазначаў выхадныя — гэта значыць, што тады яна, пэўна ж, прыедзе і будзе свята.

Толькі пасля гэтага ён вылічваў, калі Вялікдзень.

У сваю чаргу дзеці цёткі Соні чакалі прыезду цёткі Машы (так бацькавы сёстры звалі маю маму, насамрэч Марфу), бо яна ж таксама з пустымі рукамі да іх не ездзіла: вазіла тое, што мела — смятанку, тваражок, малачко і г. д.

І вось у чарговы раз мама едзе, дочкі цёткі Соні бягуць яе сустракаць. Мама, вядома ж, рада: усміхаецца ім на ўсе 32, забыўшыся, што... зубоў у роце, можна сказаць, няма (рабіла санацыю, каб ставіць «масты»). Дзяўчынкі ўгледзелі гэта і цягу.

— Алачка! Людачка! Ну куды ж вы? — не разумее цётка Маша.

А яны азірнуцца і далей бягуць.

— Мама, — крычаць, — за намі нейкая старая гоніцца, уся, як цёця Маша, ды не наша, бо без «зубей» (іхняе слоўка).

Толькі гэтак прамовілі, як тая баба на парог:

— Добры дзень у хату!

І ўжо да іх:

— Дзяўчаткі, што ж вы ўцяклі?

А тыя схаваліся за маміну спадніцу і вачэй не паказваюць.

...Насілу малых супакоілі: расказалі, што ў дарослых гэтак бывае: яны робяць новыя зубы.

Для цяперашніх дзяцей тое не навіна. Ды і пасля мульцікаў пра пакемонаў цётка «без зубей» ужо не страх.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## ЛЮБОЎ ЗЯМНАЯ

...Перад Дзядамі (ды і ў іншыя дні) варта заплюшчыць вочы, як «чуецца» голас бабулі:

— Слава Айцу і Сыну, і Святому Духу, і цяпер і заўсёды і на векі вякоў. Амінь, — шэпча яна. І ўжо больш строга дадае, — усё, унучка, а зараз — спаць.

— Але я не хачу... Ні адным вочкам, — прашуся я. — Раскажы мне казку.

— Позна ўжо...

— Не, раскажы. Пра салдата.

— Ну, слухай тады. Быў у мацеры адзіны сынок ды і таму ваяваць давялося: кулі дурныя так і лёталі, так і свісталі вакол яго. Вось адна ў сэрца і патрапіла — забіла яго. Гаруе маці, плача і дні і ночы... Сын на нябёсах пачуў гэта і паслаў суцяшэнне: раптам выглянула сонейка — асушыла ўсе матчыны слёзы. Так яна і зразумела, што нельга плакаць, а то цяжка яе сыну на тым свеце будзе...

— А хіба той свет бывае?

— Бывае, унучачка. Там жывуць усе, хто раней жыў тут, усе, пра каго мы памятаем...

— А чаму тады маці плакала?

— Таму што шкадавала сынка і вельмі любіла.

— А што такое любоў?

— Ды гэта калі для іншага чалавека анічога не шкада: ні ежы, ні пітва, ні грошай, ні часу, ні нават жыцця...

— А ты любіш дзядулю?

— Люблю, калі замуж пайшла.

— Значыць, ён таксама ўсё аддасць табе?

— Гэта, унучка, ты ў яго спытай.

— Дзеда, ты за бабулю жыццё аддасі? — перакрычваюся я.

Той маўчыць.

— Ты што, не чуеш? Жыццё аддасі?

— А ну спаць, балбатухі, — строга прыкрыквае дзед.

...Што я, пяцігадовая, магла тады ведаць пра яго і бабулю?..

Што я іх моцна любіла, хоць сэнсу гэтага слова яшчэ і не разумею... Што гэта яны ўгаварылі маіх бацькоў пакінуць мяне, малую, у вёсцы, дзе раніца пачынаецца з высокага «ку-ка-рэ-ку!», з няспыннага кудахтання курэй, з мычання кароў, а часам — з нейкага шчымлівага «цюх-цюх-цюх»... Гэта бабуля ў дзежцы мясіла цеста, каб потым, калі яно «падыдзе», ужо разам са мной «ставіць» у печ будучы хлеб. Свой! Так-так, мы самі вырасцілі жыта, сярпамі жалі, абмалацілі, змалолі і зараз пяклі! Гэта ж колькі шчасця!

Многае ўмеў і дзед: працаваць да сёмага поту, будаваць, сталярыць (на дачы дагэтуль ягоныя крэслы), рабіць валёнкі. Ён мала гаварыў, бабуля Марынка (яе за дабрыню ўсе так звалі) — намнога больш. І спявала яшчэ, заплятаючы свае тугія косы: «Когда б имел златыя горы и реки, полныя вина...»

Не ведаю, ці марыла пра іх бабуля, якая ў вайну зберагла траіх дзяцей, дачакалася з фронту мужа і ў мірны час страціла сына, але слоў крыўды на лёс я ад яе не чула — нават тады, калі жыццё яе было проста невыносным.

А здарылася вось што. Неяк зімой бабуля паслізнулася, упала і пашкодзіла пазваночнік. Параліч спачатку сагнуў яе, скаваў ніжнюю палову тулава, потым верхнюю, адняў мову...

Восем гадоў бабуля была прыкаванай да ложка. І ўвесь гэты час ля яе неадступна быў мой дзед: укладваў, пераварочваў, саджаў, карміў, прыбіраў. І ўсё — з зайздроснай пакорай, якая сведчыла, што каханне не мае межаў, што пра яго можна і не гаварыць, а проста аддаваць чалавеку ўсё: і ежу, і пітво, і грошы, і нават жыццё.

**Валянціна Паліканіна,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*




■ Неасабісты суб'ектыў

# КОЛЬКІ ВУЛІЦУ НІ МЯЦІ...



## Лічыць сябе культурным і быць ім — дзве вялікія розніцы

Мы з Багуславам Антонавічам Боўбелем землякі. Ён родам з Валмэчкі, што кіламетры за тры ад нашых Кавалёўцаў, калі ісці напрасткі, цераз рэчку. І школу мы закончылі адну, праўда, Багуслаў Антонавіч — за дваццаць гадоў да майго нараджэння. Хутка ён з'ехаў у Мінск, усё жыццё адпрацаваў на МТЗ... Аб усім гэтым я даведалася з пісьма, якое наш шматгадовы чытач прыслаў у рэдакцыю на маё імя. Праўда, некаторыя звесткі са сваёй біяграфіі мой шаноўны суразмоўнік напісаў, мяркую, не дзеля таго, каб іх публікавалі, а каб выклікаць большы давер і ўвагу да таго, што ён напісаў далей.

А далей Багуслаў Антонавіч па пунктах распісаў тое, што хвалюе яго асабіста, і што, на яго думку, павінна хваляваць астатніх. І тут я з ім абсалютна салідарная, таму спяшаюся падзяліцца меркаваннямі і высновамі майго шаноўнага завочнага суразмоўніка.

«Вось мы захапляемся: ой, які чысты і прыгожы ў нас Мінск! Няма чым асабліва ганарыцца, шаноўныя: чысты не таму, што нiхто не смеціць, а таму, што за намі пастаянна прыбіраюць. Паглядзіце, што робіцца вакол прыпынкаў грамадскага транспарту, дзе дворнікі проста не спраўляюцца падмятаць след за кожным. Ці бачылі вы калі чалавека, які, калі падышоў патрэбны транспарт, кіне недакурак у сметніцу? Не — ён шпурне яго або на праезную частку пад калёсы, або сабе пад ногі. А нядаўна мая знаёмая паслізнулася на кінутай кімсьці лупіне ад банана і зламала руку...»

А мне 7 лістапада — у трэці па ліку выхадны дзень — давялося ісці на работу. Тое, што наша вуліца ў спальным мікраёне была літаральна загаджаная пластыкавымі бутэлькамі, пакетамі ад чыпсаў, іншай дрэннню — гэта, бадай што, не дзіва. Але што падобная дрэнь можа валяцца па вуліцы Сурганава, зусім побач з галоўным праспектам, на якой і жылых дамоў асабліва няшмат, — гэта было свайго роду адкрыццём. «Культурныя жыхары сталіцы» дабраліся і сюды, а дворнікі таксама людзі, і ў іх былі выхадныя. Упершыню падумала пра тое, што, калі б у нас забаставалі на некалькі дзён супрацоўнікі камунальных службаў, сядзелі б мы па вушы ў смецці не менш за тых еўрапейцаў, з якіх у падобных выпадках ганарліва так, з прыхаванай паблажлівасцю (мы, маўляў, зусім не такія) любім пасміхацца... А дадайце яшчэ не сталічную — вясковa-дачную — тыповую менавіта для нашых шырот карціну, калі смецце вывозіцца ў найбліжэйшы лес ці хмызняк цэлымі вазамі ці прычэпамі мотаблокаў пры маўклівай згодзе бяздзейных назіральнікаў... Нам сапраўды ёсць чым ганарыцца і хваліцца?..

Далей у сваім допісе Багуслаў Антонавіч закранае тэму, якую ў нашым сарамлівым грамадстве абмяркоўваць не прынята (мо таму і не прынята, што — сорамна?), — нашы паводзіны ў грамадскіх прыбіральнях. «Там жа, прабачце, стаць няма дзе. Можна і міма ўнітаза, па-свінску. Дома ж такое вытвараць не будзеш. А тут — чаму б і не. Прыбіральшчыца прыбярэ, ёй за гэта грошы плацяць...»

Тут, як кажуць, каментарыі залішнія, і кожны з нас ведае, пра што піша мой суразмоўнік. Не ратуе нават увядзенне аплаты за карыстанне WC. Іншая справа, што ў платным месцы агульнага карыстання тая самая прыбіральшчыца сапраўды ўвесь дзень адбівае сабе ногі, носячыся з вядром і швабрай паміж кабінкамі, таму ілюзію чысціні падтрымліваць удаецца. А калі прыбіральшчыца раптам захварэе ці не выйдзе на работу з нейкай іншай прычыны? Удакладняць, у чым літаральна за дзень патоне той грамадскі туалет, думаю, не трэба. Ужо не кажу пра кашмар кожнага, хто часта ездзіць у камандзіроўкі, — прыбіральні на маленькіх вакзалах у правінцыі, зайсці ў якія можна прымусіць сябе толькі пры вельмі пільнай неабходнасці. Прычым апошнім часам многія з іх паспрабавалі давесці да ладу, падрамантавалі, паставілі новае абсталяванне. Толку, праўда, ад гэтага няшмат — людзі ж і свядомасць іхняя засталіся тыя самыя...

«Яшчэ адна наша бяда — брыдкаслоўе. Здаецца, ідуць добра апранутыя, цвярозыя людзі, размаўляюць, а праз кожныя тры словы — мат. Прычым не саромеючыся, на ўвесь голас. Тое самае і калі гавораць па мабільным тэлефоне. І ў большасці сваёй гэта людзі маладыя. Мода гэта такая, ці што? Але ж гідка слухаць...»

Я нядаўна ў адной прадуктовай краме каля касы цікавую абвестку ўбачыла, не паленавалася нават перапісаць. «Асобы, якія мацюкаюцца, знаходзяцца ў нецвярозым стане і ў выглядзе, які абражае чалавечую годнасць і маральнасць, не абслугоўваюцца...» Вось бы нешта падобнае ва ўсіх крамах, кавярнях, грамадскім транспарце з'явілася. Прычым не толькі як намер, а як дзеянне. Але ж тады, крый божа, уся інфраструктура без прыбытку застанецца...

Яшчэ Багуслаў Антонавіч разважае і пра нашы паводзіны ў крамах самаабслугоўвання («Здавалася б, узяў, колькі трэба, ды ідзі на касу, дык не, будзе рыцца ў гэтых прадуктах, як свіння пад дубам») і ў розныя кшталту чэргах («Замест таго, каб стаяць хоць бы на адлегласці кроку адзін ад аднаго, штурхаюцца, ездзяць заплечнікам суседу па твары»...). І ўсё гэта можна было б успрыняць як буркатанне немаладога ўжо чалавека, назваць вечным канфліктам пакаленняў, калі б не вельмі красамоўная і трапная назва, якую наш чытач свайму філасофска-абуранаму допісу даў: «Наўздагон Году культуры і насустрач Еўрапейскім гульням»...

Можна набудаваць прыгожых аб'ектаў і вымыць нават з мылам вуліцы, можна ўсім вывучыць некалькі фраз па-англійску і навучыцца ўсміхацца кожнаму сустрэчнаму з нагоды і без яе. А вось авалодаць тым, што называецца культурай паўсядзённага побыту, — справа нашмат больш складаная, і ніякія адміністрацыйныя меры і захады тут не дапамогуць. І пакуль будзем кідаць смецце міма сметніцы і хадзіць, выбачайце, па патрэбе міма ўнітаза — ці маем мы права чакаць ад тых жа іншаземцаў, якіх так шчыра да сябе запрашаем, што яны паедуць адсюль толькі з пазітыўнымі ўражаннямі?

Дарэчы, пра іншаземцаў. Нядаўна давялося працаваць з вынікамі аднаго цікавага сацыялагічнага даследавання, якое праводзілася пару гадоў назад сярод жыхароў нашай краіны і нашых суседзяў. Дык вось, згодна з імі, як вы думаеце, хто найперш лічыць, што мы талерантныя, гасцінныя, працавітыя? Правільна — мы самі... Яно, канешне, лічыць нашмат прасцей, чым адпавядаць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by* ■

## Извещение о проведении 21 ноября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| Предмет торгов №1 |
|---|
| В 1/к Здание административно-хозяйственное общей площадью 71,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-41417; Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ Литер Г1/к общей площадью 34,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-41418; электросети (инв. №26/3); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №27/10); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №27/9); кран-балка (инв. №27/8) |
| Площадь земельного участка – 0,1108 га, кадастровый номер 500000000002000714 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 11, 11/1 |
| Начальная цена – 93 301,54 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 9 300,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов №2** |
| Здание административно-хозяйственное, литер А 1/к общей площадью 472,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-11335; Б 1-2/к Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 762,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-11333; навес каркасный шиферный (инв. №27/2); навес-пристройка каркасный шиферный (инв. №27/3); электросети (инв. №2604); сеть водопроводная (инв. №2603); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №26/2); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №26/1); автоматическая установка пожарной сигнализации и оповещения о пожаре (инв. №42795); котел КЧЖ-7-90 «Полымя» (инв. №620/1); котел КВГТ-100 (ТЭМ-100) (инв. №420898); котел TIS UNI 75 (инв. №4000125); забор металлический (инв. №203266); резервуар для хранения нефтепродуктов (инв. №469); стеллажи складские (инв. №27/5); кран-балка (инв. №315) |
| Площадь земельного участка – 0,3237 га, кадастровый номер 500000000002000713 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 12, 12/1 |
| Начальная цена – 572 745,49 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 57 200,00 бел. руб. |

**Продавец имущества** – ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов** – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 21 ноября 2017 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 10.11.2017 по 17.11.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»)

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА на право заключения договора аренды земельного участка г. Ельске

Организатор проведения аукциона – Ельский районный исполнительный комитет.
Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право заключения договора аренды на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462

| | Предмет аукциона | Целевое назначение | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Размер задатка, реквизиты платежного документа для перечисления денежных средств, (бел. руб.) | Расходы, связанные с формированием и регистрацией земельных участков, (бел. руб.) | Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, землеустроительную документацию для ознакомления | Адрес и номер контактного телефона комиссии |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 321450100001000674 Площадь 3,2283 га по адресу: г. Ельск, Краснопильщицкий тракт. Имеются ограничения в использовании в связи с расположением его в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (охранных зонах электрических сетей), в придорожной полосе (контролируемой зоне ( автомобильной дороги. Срок аренды – 99 лет | Для строительства и обслуживания базы временного хранения строительных материалов с подъездной автомобильной дорогой (земельный участок для размещения объектов иного назначения), код по классификации 1 16 00 | 78542,92 | 7854,292 на р/с местного бюджета Ельского района BY35AKBB36004160000450000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X УНП 400034803, задаток за право заключения договора аренды | 2425,11 | Землеустроительная служба Ельского районного исполнительного комитета: г. Ельск, ул. Дзержинского Ф. Э, д. 6, тел. 8 (02354) 20585 | г. Ельск, ул. Дзержинского Ф. Э., д. 6, тел. 8 (02354) 20585 |

Аукцион состоится **11 декабря 2017 г. в 14.30 в малом зале Ельского районного исполнительного комитета, по адресу: г. Ельск, ул. Дзержинского Ф. Э., д. 6.**

**Прием документов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 7 декабря 2017 года, кабинет 1.4.**

Для участия в аукционе на право заключения договора аренды земельного участка приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**Внести задаток (задатки) не позднее 11 декабря 2017 года** в вышеуказанном размере согласно графы 5 таблицы.

**Представить в комиссию** по организации и проведению аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков Ельского районного исполнительного комитета **по адресу: г. Ельск, ул. Дзержинского, д. 6, кабинет 1.4.** следующие **документы:**

– заявление на участие в аукционе;

– документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка;

